***А. Д. Крывалап,***
*дактарант кафедры культуралогіі,*
*кандыдат сацыялагічных навук*

# ВЫКАРЫСТАННЕ ЭТНАГРАФІЧНЫХ МЕТАДАЎ АНЛАЙН

Значная колькасць работ прысвечана разгляду праблемы легітымнасці выкарыстання ўжо распаўсюджаных метадаў правядзення палявых даследаванняў у кіберпрасторы. Як праводзіць даследаванні ў інтэрнэце па аналогіі з традыцыйнай этнаграфіяй і якія адметнасці віртуальнай этнаграфі магчыма акрэсліць, а таксама якім чынам можна вывучаць сеткавыя супольнасці? Напэўна, больш шырокім пытаннем тут можа быць наступнае: у якім сэнсе этнаграфія можа быць адаптавана да сеткавага грамадства? Але ж адказ на яго не вельмі складаны, бо «не даследаванне павінна падладжвацца пад патрабаванні метадалогіі, а хутчэй апошняя павінна адпавядаць патрабаванням канкрэтных даследчых задач» [2, с. 27].

Варта патлумачыць, у якім сэнсе мы будзем разглядаць этнаграфію ў дадзеным кантэксце. Этнаграфічнае даследаванне «арыентавана на палявое вывучэнне ладу жыцця, групавых адносін, перакананняў, практык, паўсядзённай руціны, паводзін і ідэнтычнасці прадстаўнікоў у тых ці іншых супольнасцях. Яно мае сваёй мэтай апісанне, аналіз і інтэрпрэтацыю чалавечых паводзін у кантэксце той культуры, да якой яно належыць» [2, с. 25].

Але ж этнаграфія ўяўляе сабой не толькі навуковую дысцыпліну, а можа разглядацца як асобны кірунак у галіне якасных даследаванняў, што ў сваю чаргу некаторыя з даследчыкаў прапануюць называць гэту сукупнасць падыходаў сацыяльнай этнаграфіяй ці этнаграфічным метадам. «У адрозненне ад этнаграфіі ў традыцыйным сэнсе, якая імкнецца да рацыянальнай рэканструкцыі сацыяльных парадкаў у «абарыгенных» супольнасцях, этнаграфічны метад у сацыялогіі дае магчымасць вызначыць сэнс, схаваны за сацыяльнымі і арганізацыйнымі парадкамі сучасных супольнасцей» [1, с. 156].

Базавым тэкстам, які можа дапамагчы з пераносам этнаграфічнага метаду ў віртуальную прастору, з’яўляецца манаграфія Крысціны Хайн «Віртуальная этнаграфія». Яна прапануе раз-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

глядаць інтэрнэт у дзвюх магчымых постацях падвойнага тэксту: «як дыскурсіўна ствараемая культура і як культурны артэфакт тэхналогіі тэксту. (...) Адрозненне паміж інтэрнэтам як культурай і як культурным артэфактам з'яўляецца эўрыстычнай прыладай для разважанняў аб нявызначанасці ў інтэрнэце» [3, с. 39].

У дадзеным кантэксце этнаграфія мае справу з рэпрэзентацыямі рэальнасці ці «тэкставымі канструктамі рэальнасці» [3, с. 44]. І гэтыя тэксты не з'яўляюцца празрыстымі для разумення вывучаемай культуры ці практыкі. Шмат што залежыць ад разумення кантэксту, у якім ствараецца і існуе наратыў, а таксама ад асабовага досведу даследчыка. Пры гэтым падчас даследавання «выкарыстанне інтэрнэту з’яўляецца працэсам запісу і чытання тэкстаў і задача этнографа палягае ў разуменні гэтай практыкі. Разуменне сэнсу тэкстаў, аднак, далёка не літаральных» [4, с. 131].

Праблематычна, калі этнографы спрабуюць абмежаваць прастору ў Інтэрнэце, па аналогіі з сацыяльнымі межамі іншых культурных утварэнняў, як то вясковае паселішча абарыгенаў ці закрыты клуб аматараў гольфа. «Наяўныя этнаграфічныя падыходы да інтэрнэту як культуры ігнаруюць некаторыя значныя аспекты канструявання інтэрнэту як культурнага артэфакту, засяроджваючы сваю ўвагу на абмежаваных сацыяльных прасторах інтэрнэта» [3, с. 39]. Для даследавання можа быць цікавай нават сама практыка спажывання інтэрнэт-тэхналогій.

К. Хайн прапаноўвае дзесяць прынцыпаў віртуальнай этнаграфіі, на якіх нам мае сэнс спыніцца больш падрабязна [3, с. 63–65]. 1) Віртуальная этнаграфія выкарыстоўваецца ў якасці прылады для візуалізацыі выкарыстання інтэрнэту як спосабу камунікацыі і ў якасці пляцоўкі для ўтварэння супольнасцей. 2) Інтэрактыўныя медыя ствараюць выклікі і магчымасці для этнаграфіі шляхам пастаноўкі пытання: дзе насамрэч адбываецца ўзаемадзеянне, бо няма непераадольнай мяжы паміж віртуальнай камунікацыяй і «рэальным» жыццём. 3) Павелічэнне апасродкаванага ўзаемадзеяння дазваляе нам не думаць пра пэўныя месцы, дзе мусіць быць даследчык, бо мы можам разглядаць этнаграфію апасродкаванага ўзаемадзеяння як мабільны працэс і не шукаць цэнтр сацыяльнага жыцця. 4) Канцэпцыя вэб-сайта як даследчага поля ставіцца пад

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сумнеў, замест гэтага ўся ўвага канцэнтруецца на патоку і сувязях паміж удзельнікамі, а не на размяшчэнні і межах. 5) Межы не ўспрымаюцца a priori, а выяўляюцца падчас даследавання. 6) Следам за прасторавай дыслакацыяй прыходзіць часовая. Узаемадзеянне з апасродкаваным кантэкстам чаргуецца з узаемадзеяннем у іншых сферах і з іншымі медыя. 7) Віртуальная этнаграфія непазбежна частковая, бо цэласнае апісанне любога інфарманта, лакацыі або культуры ўяўляецца немагчымым. Як вынік – мы вымушаны разлічваць на рэлевантнасць статэгічных ідэй, а не на дакладныя рэпрэзентацыі аб'ектыўнай рэальнасці. 8) Віртуальная этнаграфія прадугледжвае інтэнсіўную ўключанасць у медыятызаванае ўзаемадзеянне. Узаемадзеянне з інфармантамі з дапамогай тэхналогій з'яўляецца часткай даследавання, як і, сваю чаргу, узаемадзеянне самога этнографа з тэхналогіяй. 9) Даследчык адначасова адсутнічае і прысутнічае разам з інфармантамі ў віртуальнай прасторы. Відавочна, што без тэхналогій гэта было б немагчыма. 10) Віртуальная этнаграфія з'яўляецца віртуальнай не толькі ў сэнсе бесцялеснасці. Таксама віртуальнасць нясе ў сабе канатацыю «не зусім», што не вельмі добра пасуе да практычных мэтаў.

Зразумела, што калі даследчык належыць да лічбавых імігрантаў (Digital Immigrants), то яму будзе больш складана зразумець сацыяльныя працэсы, у якія ўключаны карэнныя жыхары віртуальнай прасторы (Digital Natives) [5]. Пажадана пазбягаць сітуацыі моўнага непаразумення, якую мы можам пабачыць сёння, калі настаўнікі інфарматыкі, «якія з'яўляюцца лічбавымі імігрантамі, якія размаўляюць на састарэлай мове (яшчэ далічбавай эпохі), з усіх сіл намагаюцца навучыць насельніцтва, якое размаўляе на зусім новай мове» [5, с. 2].

Падчас традыцыйнага этнаграфічнага даследавання неабходна прыкладаць пэўныя намаганні, каб замаскіраваць прысутнасць назіральніка і зменшыць уплыў на паводзіны ў вывучаемых супольнасцях. Але ж «для анлайн-этнографа праблема трансфармуецца ў іншую: як магчыма пазнаць, дзе карыстальнік, а дзе даследчык, калі вас наогул ніхто не бачыць?» [6, с. 88]. Гэта праблема нябачнасці часам трансфармуецца ў пытанне прысутнасці анлайн. У сацыяльных сетках і інтэрнэт-месэнджэрах карыстальнікі маюць магчымасць абраць статус «нябачны» для іншых. На жаргоне інтэрнэт-карыстальнікаў – гэта «скрытні» (lurker), «якія могуць быць і дасведчаным аб

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

канкрэтным сегменце анлайн-актыўнасці, але застаюцца схаванымі ад вачэй іншых» [6, с. 91].

Такім чынам, мы разгледзелі магчымыя варыянты для выкарыстання этнаграфічных метадаў у дачыненні да віртуальнай прасторы. Віртуальная этнаграфія можа стварыць памылковае ўяўленне, што ўсё гэта вельмі лёгка зрабіць, шмат якія дадзеныя магчыма збіраць у аўтаматызаваным рэжыме, то менавіта таму, каб пазбегнуць прафанацыі, неабходна «настойваць на ўжыванні традыцыйных стандартаў у паводзінах і крытэрыяў адэкватнасці этнографа» [6, с. 92].

1. *Романов, П. В.* «Делать знакомое неизвестным...»: этнографический метод в социологии / П. В. Романов, Е. Р. Ярская-Смирнова // Социологический журнал. – 1998. – № 1–2. – С. 145–160.

2. *Улановский, А. М.* «Качественные исследования: подходы, стратегии, методы» / А. М. Улановский // Психологический журнал – 2009. – № 2. – Т. 30 – С. 18–28.

3. *Hine, C.* Virtual Ethnography / C. Hine – The Sage Handbook of Research Methods. – SAGE – 2000. – 179 p.

4. *Mackay, H.* New Connections, Familiar Settings: Issues in the Ethnographic Study of New Media Use at Home / H. Mackay // Virtual Methods: Issues in Social Research on the Internet / ed. by Hine, C. – Berg. – 2005. – P. 129–140.

5. *Prensky, M.* «Digital natives, digital immigrants part 1» / M. Prensky // On the horizon. – Vol. 9 – № 5. – 2001. – C. 1–6.

6. *Rutter, J.* Ethnographic Presence in a Nebulous Setting / J. Rutter, G. Smith // Virtual Methods: Issues in Social Research on the Internet / ed. by Hine, C. – Virtual Methods, Berg. – 2005. – P. 81–92.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Л. Е. Кульбицкая,***
*кандидат философских наук, доцент,*
*доцент кафедры общенаучных дисциплин*
*УО «Институт предпринимательской деятельности»*

# ФИЛОСОФСКО-РЕЛИГИОЗНЫЕ ПОИСКИ КРИТЕРИЕВ НРАВСТВЕННОСТИ В ТВОРЧЕСТВЕ БЕЛОРУССКИХ МЫСЛИТЕЛЕЙ ЭПОХИ ВОЗРОЖДЕНИЯ XVI–XVII вв.

Проблема обоснования абсолютных нравственных ценностей является одной из важнейших тем в философских исследованиях этической проблематики.